УДК.343.95

# НА ШЛЯХУ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВОЕ СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Молчан Андрэй Васільевіч,**
ДУА «Лапічская сярэдняя школа»
(Магілёўская вобласць, Асіповіцкі раён, а/г Лапічы, Беларусь)

*У дакладзе паведамляецца аб гістарычных этапах на шляху да незалежнасці і суверэнітэту беларускай дзяржавы праз прававыя моманты, вынікам якіх стала стварэнне сучаснай самастойнай і незалежнай Рэспублікі Беларусь. Даецца гісторыка-прававая характарыстыка і адзнака кожнага з іх.*

Кожная сучасная дзяржава ў свеце мае свой уласны шлях да суверэнітэту. Не выключэннем з'яўляецца і сучасная Рэспубліка Беларусь. Для нашай краіны ён быў цяжкі і складаны, але ў той жа час ад гэтага не меней і цікавы.

Першай беларускай дзяржавай безумоўна з'яўляецца Полацкае княства. Але першым пісьмовым прававым помнікам не толькі беларусаў, але і ўсіх усходніх славян – "Руская Праўда" Кіеўскай Русі. Змест Праўды ўтрымліваў апісанні судовага працэсу, правядзення і здабычы судовых доказаў, а таксама меры пакаранняў. З гісторыі вядома, што Полацкае княства пастаянна вяло барацьбу з Кіевам за сваю самастойнасць. Але тым не меньш распаўсюджвалася "Руская Праўда" на ўсе землі ўсходніх славян: Полаччына, Наўгародчына, Кіеўшчына, Чарнігаўшчына і інш.

Калі казаць пра першую Канстытуцыю на беларускіх землях, ці спробу стварэння яе, дык тут шматлікія даследчыкі гісторыі і права разыходзяцца ў думках і поглядах, і адны з іх называюць першай Канстытуцыяй менавіта Статут Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) 1588 г. За час існавання ВКЛ, было выдадзена тры Статуты: 1529 год, 1566 год і 1588 год. Аднак апошні з іх замацоўваў і рэдагаваў папярэднія выданні. Але ці з'яўляўся ён насамрэч Канстытуцыяй? Калі ўглыбіцца ў падзеі таго часу, то вядома, што адна з яго мэтаў і была замацаваць і падкрэсліць самастойнасць ВКЛ ад Польшчы. Безумоўна, Статут, па сутнасці скасоўваў Крэўскую ўнію, згодна з якой ВКЛ



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

павінна было проста ўвайсці ў склад Польшчы. І, згодна Статуту, ВКЛ захавала пэўную самастойнасць. Аднак не аб якой поўнай незалежнасці, якую павінна замацоўваць Канстытуцыя, канешне нават і не магло ісці размовы, бо Княства так і праіснавала з Польшчай у адной дзяржаве – Рэчы Паспалітай, да самога сканчэння яе існавання як дзяржавы ў 1795 г.

Што ж наконт астатняга, дык Статут таксама змяшчаў артыкулы, прысвечаныя правам і абавязкам усіх грамадзян ВКЛ, шмат увагі ўдзялялася судовай справе, што ў прынцыпе змяшчаюць Канстытуцыі сучасных краін свету, у тым ліку і Беларусі. Так жа падкрэсліваецца абмежаванасць улады Вялікага князя, што падкрэслівае дэмакратычнасць дзяржавы таго часу. Праўда, што датычыцца правоў і свабод, дык Статут у гэтым сэнсе даваў пашыраныя правы ў асноўным толькі шляхецкаму саслоўю. Але гэта дыктуе не Статут, а сам час, дзе яшчэ існавала саслоўнае раздзяленне насельніцтва. Ды й сялянства па сваёй сутнасці ў той час нічога не мела акрамя абавязкаў, бо нават свае нешматлікія правы не ведала, таму што даведацца аб іх не магло з прычыны няграматнасці і агульнай адсутнасці ведаў у якой-небудзь навуцы, акрамя апрацоўкі зямлі і вядзенні гаспадаркі. Таму можна сказаць, што фактычна Статут ВКЛ працаваў для інтэрэсаў часткі насельніцтва: адна частка мела з большасці правы, а другая – з большасці абавязкі.

Далей ужо была створана агульная Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, якая выйшла ў свет 3 мая 1791 г. Вось яна ўжо афіцыйна прызнаецца першай Канстытуцыяй Еўропы. Але праіснавала не доўгі тэрмін, бо праз некалькі год Рэч Паспалітая была падзеленая паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй ды ўвогуле знікла з карты Еўропы як дзяржава. Канстытуцыя была накіравана на захаванне краіны, абарону свайго суверэнітэту і незалежнасці. У яе адразу з'явіліся па розных прычынах і прыхільнікі, і праціўнікі. Аб шырокіх грмадзянскіх правах, і тым больш свабодзе і роўнасці правоў і абавязкаў для ўсяго насельніцтва, у ёй не гаварылася. Ды й зразумела, бо мэта была іншая. Але, менавіта гэта акалічнасць і стала потым лёсавызначальным момантам.

Са знікненнем Рэчы Паспалітай пачынаецца новы перыяду нашай гісторыі, дзе беларускія землі знаходзяцца ў складзе Расійскай імперыі. Расійскія ўлады яшчэ нейкі час дапускалі існаванне Статута 1588 г. на нашых землях, бо ён, нягледзячы на сваю даўнасць, усё ж больш адпавядаў старадаўнім традыцыям жыцця беларускага насельніцтва, чым расійскае заканадаўства. Нягледзячы на ўсе недахопы Статута, усё ж такі ён быў лепей за расійскія законы, якія не прадугледжвалі аніякіх свабод, нават абмяжоўваючы сваё прывілеяванае саслоўе – дваранства. Але расійскія ўлады не адразу рашыліся на гвалтоўныя змены ў нашых землях, таму карысталіся заканадаўствам ВКЛ ажно да 1840 г., да поўнага скасавання Статута 1588 г. Вядома ж, ні пра якую Канстытуцыю ў Расіі нават і думкі не павінна было быць. Сярод расійскага дваранства такая думка была, але царскае самаўладдзе не хацела нават хоць нейкім чынам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абмяжоўваць сваю ўладу. Таму ўсе спробы прыхільнікаў стварэння расійскай Канстытуцыі жорстка прысякаліся ўладай.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі ў 1917 г., пад час якой расійскае самаўладдзе пала, беларусы загаварылі аб стварэнні сваёй уласнай дзяржавы. 25 сакавіка 1918 г. было абʼяўлена аб незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. За вельмі кароткі час яе існаваня, адведзены гісторыяй, ураду БНР удалося стварыць многа, але Канстытуцыю, якая б замацавала незалежнасць і суверэнітэт маладой беларускай дзяржавы, нажаль, стварыць так і не ўдалося. Мажліва б і лёс яе быў зусім іншым. І ўжо ў 1919 г., Беларуская Савецкая Сыцыялістычная Рэспубліка стварае Канстытуцыю. Пачынаецца новы, савецкі перыяд гісторыі Беларусі. За час існавання савецкай Беларусі паступова ствараецца і дзейнічае некалькі Канстытуцый – 1919 г., 1927 г., 1937 г., 1978 г.

Калі казаць ужо пра гэты этап беларускай дзяржаўнасці і права, то трэба ў першую чаргу адзначыць і падкрэсліць, што яны цалкам адпавядалі таму часу і ўмовам існавання ў Савецкім Саюзе (СССР), бо цалкам апіраліся на агульную дзяржаву і Канстытуцыю СССР (у 1919 г. – на Канстытуцыю РСФСР). У іх змяшчаліся палажэнні, якія ў большасці адпавядалі рэчаіснасці савецкай палітычнай сістэме, будуючай савецкі лад і грамадства. Напрыклад, гаварылася аб свабодзе і правах грамадзян, а насамрэч усё праходзіла згодна партыйнай лініі КПБ(б) (пазней КПСС). Адначасова нават і падкрэслівалася вядучая роля ў дзяржаве толькі партыі. Але рабілася гэта такім чынам, што камуністычная партыя і была народам. Такім чынам Канстытуцыі замацоўвалі забарону ўсялякай іншай думкі, бо лічылася. што ў СССР думкі іншай, акрамя поглядаў партыі быць не можа. Таму ў рэальнасці іншадумцаў вынішчалі, нават калі іх і не было, іх стваралі. Таму пры наяўнасці Канстытуцыі ў СССР і запісаных у ёй свабодах і правах, іх рэальна не існавала. Таксама казалася пра свабоду народаў і рэспублік, якія ў любы момант маглі пакінуць Саюз, але, вядома, што па факту гэтага не магло адбыцца.

Іншая сітуацыя склалася на прыканцы 1980-х гг., калі пад пытаннем стаяла ўжо існаванне самога Савецкага Саюза. 1990 год у гісторыі названы як год “Параду суверенітэтаў”. З СССР пачалі выходзіць адна рэспубліка за другой. Стварыла сваю дэкларацыю суверэнітэту і Беларусь. Але пакуль аб Незалежнасці казаць было рана. Дэкларацыя набыла канстытуцыйны статус, а ў 1991 г. Беларусь абʼявіла сябе незалежнай краінай. Толькі пасля гэтага была створана і Канстытуцыя, якая ўступіла ў сілу 15 сакавіка 1994 г.

Канстытуцыя замацавала суверэнітэт краіны, правы і свабоды ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь, незалежна ад полу, стану ў грамадстве. Яна зʼяўляецца асноўным і галоўным Законам краіны. Артыкулы Закона датычацца абсалютна ўсіх грамадзян рэспублікі. Складзена была Канстытуцыя зыходзячы з міжнародных прававых правілаў і норм, а таксама Усеагульнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дэкларацыі праў чалавека, а таксама міжнародных канвенцый, якія датычацца правоў чалавека, якія падпісала і Рэспубліка Беларусь. Канстытуцыя аб'яўлена ад імя народа і пачынаецца са слоў: "Мы, народ Рэспублікі Беларусь (Беларусі)." [3, с. 3], гэта кажа аб тым, што краіна належыць выключна яе народу і нікому больш і гэта менавіта ён стварыў сваю ўласную незалежную дзяржаву, і ўлада ў ёй належыць выключна народу.

Такім чынам, каб падвесці вынік усяму вышэйсказанаму, трэба адзначыць некалькі галоўных высноў.

Па-першае, беларускі народ не адразу і не нядаўна пачаў ствараць сваю дзяржаўнасць, а шмат вякоў таму назад, і ў адпаведнсці з гэтым пастаянна спрабаваў заканадаўча замацаваць свае правы і свабоды, падкрэсліваючы такім чынам сваю самастойнасць сярод іншых народаў свету.

Па-другое, шлях да самастойнай і незалежнай беларускай дзяржавы быў вельмі складаны, цяжкі і разнастайны.

Па-трэцяе, галоўная і неабходная задача для далейшага станаўлення і развіцця не толькі нашай, а і любой краіны свету, як дэмакратычна-прававой, развітай у цывілізаваным сусветным грамадстве – гэта не толькі наяўнасць Канстытуцыі , але і фактычная яе дзейнасць.

**Спіс крыніц**


1. **Доўнар, Т. І.** Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. – 2-е выд. – Мінск, 2008. – 400 с.
2. **Доўнар, Т. І.** Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.) : вучэбны дапаможнік / Т. І. Доўнар. – Мінск : Белдзяржуніверсітэт, 2001. – 76 с.
3. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. 17 октября 2004 г.). – Минск : Амалфея, 2014. – 48 с.
4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. : пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – 207 с.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1997. – Т. 4 : Кадэты – Ляшчэня. – 432 с.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2001. – Т. 6 : Кніга 1 : Пузыны – Усая. – 591 с.
7. **Юхо, Я. А.** Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 270 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова